View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE

УДК 002.2(091)(476)

# ВЫДАННІ ПІНСКАЙ ЕЗУІЦКАЙ ДРУКАРНІ XVIII СТ.: СТАН ДАСЛЕДВАННЯЎ

***Анатоль Сцебурака***
*Мінск, Беларусь.*

Аўтар аналізуе супярэчнасці ў поглядах на выдавецкую спадчыну пінскай езуіцкай друкарні ў першай палове XVIII ст. На падставе кнігазбору НББ вывучае асаблівасці пінскіх старадрукаў.

***Ключавыя словы: Ордэн езуітаў, старадрукаваныя кнігі, друкарня ў Пінску***

Полесу

Кніжная культура Беларусі надзвычай цікавая і захапляльная з'ява, бо яна адначасова закранае шэраг узаемазвязаных аспектаў з рэлігійных, этнічных, палітычных, эканамічных і сацыяльных працэсаў. Пры агульным поспеху апошніх дзесяцігоддзяў ў вывучэнні дадзенай праблематыкі застаецца шэраг нявырашаных пытанняў, які патрабуюць пільнай увагі. У прыватнасці, так выглядае справа з пінскай езуіцкай друкарняй, якая дзейнічала некалькі дзесяцігоддзяў у першай палове палове XVIII ст.

Нельга сказаць, што пінскіх езуітаў абышлі ўвагай. Унікальны архітэктурны помнік – гмах калегіўма, які і зараз здзіўляе маштабам і гармоніяй, не дазваляе забыцца пра яго стваральнікаў – каталіцкі ордэн імя Ісуса. Сярод розных аспектаў дзейнасці ордэну спынімся на іх друкарскім чыне, які выклікае столькі пытанняў у беларускіх, польскіх і літоўскіх навукоўцаў. А дыскутуюць знаўцы кнігі амаль аб усім: ад дат працы друкарні да рэпертуару яе выданняў.Таму дадзены артыкул мае на мэце найперш звярнуць увагу на актуальны стан вывучэння пінскай езуіцкай друкарні, акцэнтуючы ўвагу на прыгаданых кантраверсіях.

Пінскі езуіцкі калегіўм адлічвае сваё існаванне ад 1638г., калі ён быў створаны на базе рэзідэнцыі ордэну. За час яго існавання да 1773 г. тут паспелі рэалізавацца разнастайныя віды дзейнасці манахаў: музычная бурса, аптэка, тэатр, шпіталь для бедных і друкарня. Маштаб актыўнасці пінскіх езуітаў вымагаў уласнага друкарскага варштату.

Як трапна падкрэсліў М. Нікалаеў, пінская друкарня стала "*адзінай новай друкарняй, што ўзнікла ў ВКЛ пад час праўлення Аўгуста II*". [1, с. 270] Больш дакладныя даты яе дзейнасці застаюцца адкрытымі. Прынамсі, зараз мала хто спрабуе сцвярджаць іх з упэўненасцю. Энцыклапедыя гісторыі Беларусі ўсталёўвала наступныя храналагічныя межы для друкарні: 1727 – 1735 гг. [2], Пазней, Т. Рошчына ў Энцыклапедыі ВКЛ элегантна выходзіць з сітуацыі, ставячы "?" каля дат 1729 – 1746 гг. [2] Літоўская даследчыца Я. Місюнене прапаноўвае абмежавацца 1738 г., як часам знікнення друкарні. Пры гэтым яна спасылаецца на аўтарытэтнае меркаванне польскай калегі М. Цубжыньскай-Леанарчык. [4, 5] Існуе яшчэ шэраг згадак аб пінскай друкарні у гістарычнай літаратуры XIX – XX ст., дзе проста апісваюць яе дзейнасць у 1730–40 гг.[11] Менавіта ў першай палове 1730-ых гг. у Пінску працавалі адмыслоўцы з Варшавы: Кучынскі Ежы (прэфект друкарні) і Тамаш Тхаржніцкі. Пасля ад'ездупрэфекта з Пінску, відаць, і пачаўся часовы перапынак у працы тамтэйшай друкарні. Паводле адных крыніц, выдавецкая дзейнасць з гэтага моманту спынілася, паводле іншых – аднавілася ў 1741 гг. і працягвалася да 1746 г. Разнабой ў даце ліквідацыі друкарні як раз і палягае ў пытанні: ці выйшла ў Пінску яшчэ што-кольвек пасля 1735 г.? Класічная версія, найбольш пашыраная ў беларускай даведачнай літаратуры адказвае станоўча. Быццам з 1741 года пачынаецца

[11] Сустракаюцца і больш радыкальныя меркаванні пра пінскія выданні, якія выходзяць за агульна прынятыя рамкі. Найбольш ранні варыянт 1672 г., позні – 1752 г. Версіі крытычна аналізуюцца ў артыкуле Т.І. Рошчынай "*Выданні пінскіх езуітаў*" [6].

новы этап працы гэтай друкарні, але ўжо з іншым тэматычным напаўненнем прадукцыі (свецкая літаратура розных жанраў: панегірыкі, эпіграмы і зборнікі “*Silva rerum*”). У пацверджанае таму Т. Самайлюк піша, што “*Забаўкі публічныя*” Казіміра Несялоўскага выйшлі “*у новай друкарні ў Пінску 3.VIII.1743 г.*”[7, с. 97] А апошнім пінскім друкам стала кніга “*Чатырохбаковыя разважанні*” Адама Несялоўскага ў 1746 г. Яна прапаноўвае цікавую версію аб тым, што Казімір Несялоўскі ўзяў у арэнду варштат у езуітаў, чым і тлумачыцца з’яўленне гэтай загадкавай “ *новай друкарні ў Пінску*”.

Такім чынам, даты існавання гэтай друкарні амаль цалкам залежаць ад справы прызнання некаторых кніг прадукцыяй пінскіх езуітаў. Але факт застаецца фактам: шэраг гэтых выданняў з’яўляліся без азначэнням месца публікацыі. На падставе аналізу менавіта гэтай прыкметы Я. Місюнене рэгіструе толькі адно выданне з Пінску – зборнік казанняў Пятра Скаргі, якое выйшла ў 1735 г. з красамоўным надпісам на тытульным лісце “*W Pińsku : w Drukarni Collegium Societatis Jesu, 1735*”[12] [8]. А выданні 1740-ых гг. даследчыца схільная лічыць вынікам размяшчэння замоў пінскімі езуітамі ў Супрасльскай друкарні. Пагадзіцца з такім варыянтам гісторыі друкарні магчыма, бо пінскія айцы-езуіты практыкавалі выкананне сваіх праектаў у іншых тыпаграфіях. Возьмем хаця б іх шчыльную супрацу з віленскай друкарняй свайго ордэну, якая цягнулася праз частку XVII і XVIII ст. [9, с. 126] Што падштурхнула палескіх манахаў да такога кроку?


KAZANIA
Ná
NIEDZIELE
Y
SWIĘTA,
Cáłego Roku.
Wielebnego Xiędza
PIOTRA SKARGI
Societatis JESU.
Trzy rázy do Druku w Krákowie
PODANE.
Teraz czwárty raz
Zá Dozwoleniem Stárszych
PRZEDRUKOWANE.
w PINSKU
...rni Collegium Societatis JESU, Roku Páńskiego
1735.

Малюнак 1. Тытульны аркуш пінскага выдання казанняў Пятра Скаргі (1735 г.)


w PINSKU
Collegium Societatis JESU, Roku
1735.

Малюнак 2. Фрагмент тытульнага аркуша пінскага выдання казанняў Пятра Скаргі (1735 г.)

Магчыма, гэта было звязана з тэхнічнымі складанасцямі, ці адсутнасцю кваліфікаваных кадраў.

Для ілюстрацыі такога ўзаемадзеяння возьмем некалькі выдання пінскіх езуітаў, якія адлюстроўваюць іх адносіны з Міхалам Сервацыям Вішнявецкім (1680 – 1744) на працягу некалькіх дзесяцігоддзяў. Гэтыя цікавыя выданні сабраныя ў канвалюце са славутай Нясвіжскай бібліятэкі Радзівілаў (кніга зараз захоўваецца ў НББ). Гэта “*Konstellacya xiązęcych planet Xięzyca y Marsa …*”, якую выдалі ў віленскай езуіцкай друкарні па пінскай замове ў 1725 годзе. Гэта было красамоўна адзначана на тытульным аркушы: “*od Kollegium pińskiego Societatis Iesu*” [10]. Нагодай стаў другі шлюб Міхала СервацыяВішнявецкага, гетмана польнага літоўскага а за адно і старасты пінскага, з Марыяй Магдаленай Чартарыйскай, дачкой вялікага харунжага літоўскага, а ў свой час таксама пінскага старасты, Юзафа Чартарыйскага. Але не толькі ўрачыстыя падзеі ў жыцці князя Вішнявецкага суправаджаліся друкамі пінскіх езуітаў. У 1745 г. манахі ў жалобе з-за яго смерці зноў выдалі ў Вільні кніжачку “*Zal z uwagą nad śmierćią świętey pamięći jasnie*

[12]Асобнік з НББ – 094/5352К дэталёва апісаны Т.І. Рошчынай у артыкуле “*Выданні пінскіх езуітаў (XVIII ст.)*”.

*oswieconego xiązęcia jmci Michala Serwacego na Wisnowcu Wisniowieckiego*”, якую яны перадалі трэцяй па ліку жонцы нябожчыка-мецэната – Тэклі Ружане з роду Радзівілаў[13][11].

У спісе спрэчных пінскіх выданняў ёсць дзве невялічкіх кніжачкі з нагоды шлюбу Яна Караля Мнішка (1716 – 1759) з Кацярыны з Замойскіх.Нявеста прынесла мужу ў пасагу шэраг зямель роду Вішнявецкіх разам з Вішняўцом на Валыні, дзе яны разам і пачалі жыць [12, с .463]. Для нас гэтыя выданні цікавыя яшчэ і тым, што не так даўна гэтыя рарытэты выяўленыя ў фондзе НДА кнігазнаўства НББ.

Кнігі з’явіліся як раз пасля шасцігадовага перапынку ў працы пінскай друкарні ў 1741 г (разам з яшчэ некалькімі выданнямі гэтага году). Гэтыя выданні ў Эстрайхера ўлічаныя як адзін асобнік, але час ад часу яго апісваюць як дзве паасобныя кнігі з-за наяўнасці цалкам самастойнай структуры (з двума тытульнымі лістамі “*Hebdomas Saeculorum*” і “*Prawo ná nieśmiertelną sławę*”) і розніцы ў мове (латынь і польская) [13, с.461]. Дэ-факта, гэта дзве тэматычна звязаных, але фізічна асобных кнігі. Толькі наяўнасць кустоды на апошняй старонцы “*Hebdomas Saeculorum*” кажа аб тым, што кнігі выходзілі ў свой час разам. Раней лічылася, што гэтых кніг няма ў Беларусі. Але гэтыя выданні не так даўна выяўленыя ў галоўным кнігазборы Беларусі. Знаёмства з імі паказвае, што ўсюды ў тэксце фігуруе адсылка да пінскіх езуітаў, якія імкнуцца як найлепей павіншаваць мецэнатаў са шлюбам і адначасова нагадаць пра сябе. На жаль, на тытульным аркушы няма месца выдання. Прысутнічае формула “*Polessiacâ Dodonâ ab Athaenaeo Ducali Pinscena Societatis Jesu Votivo Drammata celebrata*”, якая ўказвае на пінскіх езуітаў. У канцы двух гэты кніг прыгадваюцца пінскія езуіты (У “*Hebdomas Saeculorum*” гэта атэнэум пінскага ордэну езуітаў, а ў “*Prawo ná nieśmiertelną sławę*” гэта цэлы эпілог ад імя пінскай палестры)) [15, 16]. Паводле сённяшніх звестак, гэтыя кнігі выйшлі не ў Пінску, а ў Супраслі. Але для даследчыкаў пінскага калегіўма гэта не робіць іх менш цікавымі, бо змястоўна яны цалкам належаць палескаму гістарычнаму кантэксту.


PRAWO
Ná nieśmiertelną Sławę
Prześwietney ZAMOYSKICH Prozapij
Zelaznym Herbownych Kopij ſtylem
od Starodawnych wiekow
PISANE,
Teraz
Jaśnie Wielmożney Jey Mości PANI
KATARZYNIE
z ZAMOYSKICH
MNISZCHOWEY
Łowczyney Koronney
PREZENTOWANE;
Do czytania Publiczney Famie
Apollinowym piorem
Przy Theatralnych ogniow illuminacyi
PRZEKOPIOWANE.
Od obligowanego Pańſkiemu Imieniowi
Athenæum Pińſkiego.
Roku
Prawodawcy Chryſtuſa
1741.

*Малюнак 3. Тытульны аркуш кнігі “Prawo ná nieśmiertelną sławę prześwietney Zamoyskich” (1741).*

На жаль, невялікі тэкст артыкулу не ў стане даць паўнавартасны нарыс стану даследавання пінскай езуіцкай друкарні. Ён меў значна больш

[13]Яшчэ адно віленскае выданне пінскіх езуітаў з нагоды смерці мецэната Вішнявецкага з’явілася пад іншым тытулам у 1745 годзе (“*Monumentum doloris post dolenda fata celcissimi principis Michaelis Servatii Korybuthin Wiśniowiec Wisnowie*cki…”) [14].

сціплую мэту – працягнуць традыцыю вывучэння складаных аспектаў яе існавання на прыкладзе асобнікаў, якія зберагаюцца ў Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Магчыма, новыя архіўныя знаходкі і звесткі аб лёсе вывезенай у 1940 г. бібліятэкі пінскага езуіцкага калегіўма стануць крокам да паглыблення ведаў пра выдавецкую дзейнасць гэтай ўстановы.



EPILOG.

SAturnus wſzyſtko pożeraiący, ſamego nie może ſpożyć ſtruśia. Skąd Geniuſz Imperij, y Geniuſz Polſki cały JASNIE WIELMOZNYCH MNISZCHOW DOM, y z Kolligowane Krwią Onemu pierwſze w Sarmacyi ZAMOYSKICH, WISNIOWIECKICH, RADZIWIŁŁOW Fámilie wieczności Konſekruie. Geniuſz záś Pińſkiey Páleſtry JASNIE WIELMOZNYM MECENASOM winne oddaie Dźięki.

*Малюнак 4. Эпілог кнігі "Prawo ná nieśmiertelną sławę prześwietney Zamoyskich (1741).*


1. Гісторыя беларускай кнігі / Кніжная культура Вялікага Княства Літоўскага / М. В. Нікалаеў. – Т. I. – 2009. – 423 с.
2. Пінскі езуіцкі калегіум // Энцыклапедыя гісторыі Беларусі. – Т.5.– 1999. – С. 500.
3. Рошчына Т.І., Пінская друкарня // Энцыклапедыя Вялікага Княства Літоўскага. – Т.2. – 2006. – С. 434.
4. Мисюнене, Я. Издания, вышедшие на территории Беларуси в XVI-XVIII вв., в фондах Национальной библиотеки Литвы / Я. Мисюнене. – Здабыткі. Дакументальныя помнікі на Беларусі. –Мінск : НББ. – Вып. 10. – 2010. – С .13–31.
5. Cubrzyńska-Leonarczyk, M. Oficyna supraska, 1695-1803: Dzieje i publikacje unickiej drukarni ojcow bazylianow. – Warszawa: Biblioteka Narodowa, 1993. – 227 s.
6. Рошчына, Т.І. Выданні пінскіх езуітаў (XVIII ст.) / Т.І. Рошчына // Матэрыялы Другіх Кнігазнаўчых чытанняў "Кніжная культура Рэчы Паспалітай" (Мінск, 15-16 верасня 2000 г.). – Мінск, 2002. – С. 229–235.
7. Самайлюк, Т. Друкарня езуітаў у Пінску / Т. Самайлюк // Спадчына. – 2003. – № 4-5. – С. 96–99.
8. Kazania na niedziele y swięta całego roku / Piotra Skarga – W Pińsku : w Drukarni Collegium Societatis Jesu, 1735 – 585 s.
9. Kraszewski, J. Wspomnienia Wołynia, Polesia i Litwy.– T. I. –Wilno : druk T. Glücksberga, 1840 – 231 с.
10. Konstellacya xiążęcych planet Xiężyca y Marsa, Saturnowe wieki pod oyczystym słońcem rokująca, przy weselnym akćie jaśnie oświeconego xiążęćia jego-mośći Michała Serwacyusza na Zbarażu y Wiśniowcu Wisniowieckiego kanclerza Wielkiego Xięstwa Litewsk: Pińskiego, Wiłkowiskiego &c. &c. starosty: y jasnie oswieconey xiężny iey-mosci Magdaleny Czartoryskiey chorążanki Wielkiego Xięstwa Litew: zapatrującemu się na wesoły widok polskiemu światu poetyckim piorem ukazana od Kollegium pińskiego Societatis Iesu. – w Wilnie : w Drukarni Akadem: Soc: Jesu, 1725. – [10] с. асобнік у НББ; канвалют: 094/1615К)
11. Zal z uwagą nad śmierćią świętey pamięći jasnie oswieconego xiązęcia jmci Michala Serwacego na Wisnowcu Wisniowieckiego hrabi na Dołsku, Dąbrowicy, Komarnie, y Brahiniu, woiewody Wilenskiego, hetmana wielkiego W. X. Litewskiego, Tucholskiego, Gliniańskiego, Mereckiego, Wilkowiskiego, Wilkiskiego &c. starosty; oyczyzny nad synem, familii nad ustaiącym imieniem, naymnieyszego Societatis Jesu zakonu nad swoim fundatorem publiczną kondolencyą oswiadczony. Oraz jasnie oswieconey xięznie jeymsci Tekli z xiąząt Radziwiłłow Wisniowieckiey woiewodzinie wilenskiey, hetmanowey wielkiey W. X. Litewskiey, Tucholskiey, Gliniańskiey, Mereckiey, Wilkowiskiey, Wilkiskiey &c. staroscinie przy pogrzebowym akćie prezentowany od obligowanego fundatorskiemu imienowi Kollegium Pińskiego Societatis Jesu. – W Wilnie : w Drukarni J. K. M. Akademickiey Societatis Jesu, 1745.– 20 с.
12. Mniszech Jan Karol // Polski Słownik Biograficzny. – T. XXI/3. – Wroclaw, 1976. – S.463 – 465.
13. Estreicher, K. Bibliografiapolska / K. Estreichera. Cz. 3 : (Obejmująca druki stóleci XV–XVIII). –T. 11 (22). – Kraków: wydanie Akademii Umiejętności, 1908. – С. 461.
14. Monumentum doloris post dolenda fata celcissimi principis Michaelis Servatii Korybuth in Wiśniowiec Wisnowiecki, comitis in dołsk, Dąbrowica, Komarno, & Brahin palantini Vilnensis, supremi ducis exercituum M. D. Litvaniae, Tucholiensis, Glinianensis, Merecensis, Vilkoviensis, Vilkiscensis &c. &c. capitanei, unico filio à patria, ultima sangvini à familia, singulari fundatori à minima Jesu Societate erectum, atq[um] sub tristem publici funeris actum,


ПолесГУ

lugubri calamo delineatum ab obligatissimo, fundatorio nomini et honori Collegio Pinscensi Jesu. – Vilnae:Typis S. R. M. Academicis Societatis Jesu, 1745. – 42 c.

15. Prawo ná nieśmiertelną sławę prześwietney Zamoyskich prozapij zelaznym herbownych kopij stylem od starodawnych wiekow pisane, teraz Jaśnie Wielmożney Jey Mośći Pani Katarzynie z Zamoyskich Mniszchowey Łowczyney koronney prezentowane; do czytania publiczney Famie Apollinowanym piorem przy teatralnych ogniow illuminacyi przekopiowa. – [Б. м.], 1741.– 14 c.
16. Hebdomas Saeculorum inter continuatas integrô Septenniô Victorias Bellico Opere Olim a Generalissimo in Occidentali Imperio Exercituum Duce impensa atq; ad recolendum perenni aetatum memoriâ triumphum Dierum memorabilium Festis Septenâ Martis Alumnae Volneris pennâ â Carolo Magno inserta nunc verò applaudente inter solemnes Hymenaei thaedas Illustrissimi ac Excellentissimi Domini Domini Joannis Mniszech S. R. J. & in Magna Kończyce & Osownica Comitis, Venatoris Regni, Jávoroviensis &c. Capitanei S. R. M. Colonelli, Polessiacâ Dodonâ ab Athaenaeo Ducali Pinscena Societatis Jesu Votivo Drammata celebrata. – [Б. м.], 1741. – 12 c.

ПолесГУ